# Калейдаскоп

**ліпень-жнівень 2023**

**Школьная газета №10 (50)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*
*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову



**Хоць яго з поля, як зелле, высмоктвалі,**
**Не забывалася ў долі нясытае, -**
**Не забывалася ў долі нясытнае, -**
**Намі навечна ў насевак усыпана**
**Роднае слова. (М. Лужанін)**

**Хто забыў сваіх продкаў - сябе губляе, хто забыў сваю мову - усё згубіў.**
**(У. Караткевіч)**

**Магутнае слова, ты, роднае слова!**
**Са мной ты на яве і ў сне. (Я. Купала)**

**Не забудзьма ж нашчадкам сваім**
**Перадаць у нязменнай красе**
**Наша добрае слова. (А. Вялюгін)**

**Ведай: роднае слова грымела**
**У крывавым агні барыкад,**
**За свабоду адважна і смела**
**Заклікала ў паход, як набат. (Н. Гілевіч)**

**Дарагая, магутная мова народа майго! Ты жыць вечна будзеш! ("Полымя")**

**У бліндажы, ў траншэі вузкай,**
**Хоць бой упарты бушаваў,**
**А роднай мовы беларускай**
**Ніколі я не забываў. (П. Прануза)**



# Народныя традыцыі



Сучасная беларуская назва сярэдняга, самага спякотнага месяца лета **“ліпень”** паходзіць ад слова “ліпа”. (Дрэва цвіце менавіта ў гэтую пару). Найменне мае падабенства з польскім lipiec і ўкраінскім липень. У старабеларускіх крыніцах акрамя назвы липець сустракаецца яшчэ чирвець, што захавалася дагэтуль, напрыклад, у чэшскай, славацкай і беларускай мовах (чэрвень) у папярэднім месяцы.

Рымляне да 44 года называлі месяц проста пятым (quintilis), паколькі год пачынаўся з сакавіка. Затым з прычыны трагічнай смерці Юлія Цэзара перайменавалі квінтыліс у Юліус (julius), таму і захаваліся juillet — у французаў, Juli — у немцаў, July — у англічан, июль — у рускіх.

У гэтым месяцы старажытныя грэкі адзначалі чатырохдзённае свята Панафінеяў у гонар багіні мудрасці Афіны (рымляне называлі яе Мінервай). Падчас вялікага святкавання адбываліся ўрачыстыя працэсіі, розныя народныя гульні (барацьба атлетаў, гімнастычныя практыкаванні), спевы, танцы.

**Ліпень** — самы дажджлівы месяц года, палова дзён яго бывае з ападкамі, вызначаецца недабранадзейнасцю надвор’я і асабліва ліўнямі. Здараецца і сухая пара.



## НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

**Сёмы месяц** Грыгарыянскага календара. Складаецца з 31 дня. Назва паходзіць ад слова «ліпа». (Дрэва цвіце менавіта ў гэтую пару.) Рымляне да 44 года называлі месяц проста пятым (квінтыліс), паколькі год пачынаўся з сакавіка. Затым з прычыны трагічнай смерці Юлія Цэзара перайменавалі квінтыліс у юліус, таму і захаваліся juillet – у французаў, Juli – у немцаў, July – у англічан, июль – у рускіх.

**Прыметы ў ліпені**

У ліпені на двары пуста, а ў поле густа. У ліпені хмары распасціраюцца па небе палосамі — будзе дождж. Калі раніцай трава сухая — да ночы чакай дажджу. Зелянявая афарбоўка месяца — прыкмета наступу моцнай засухі.

У ліпені калі можна ўяўна павесіць вядро на рог месяца — быць сушы. Калі ж вядро «валіцца» — да дажджу. Гэта прымета прадказвае надвор'е за адзін-два тыдні наперад. Раніцай туман  сцелецца па траве — будзе добрае надвор'е. Усім лета прыгожа, ды верхавіна лета цяжкая». Калі ў трэцяй дэкадзе ліпеня лісце бярозы пачынае жоўкнуць з верхавіны — чакай ранняй восені і вясны.

**6 ліпеня.** Купала (Купалле) – старажытнае абрадавае свята сонца і агню, урадлівасці і росквіту зямлі. Прымяркоўвалася да летняга сонцастаяння. «Дзень адбаўляецца, ноч прыбаўляецца», – кажуць у народзе, і нездарма захаваўся звычай наглядаць за свяцілам як «сонца грэе». «Сёння Купала, заўтра Іван…», – гаворыцца ў песнях. Гэтыя і іншыя факты даюць падставу сцвярджаць, што Купала – язычніцкае свята.

Папараць-кветка — асноўная купальская кветка, якая. згодна легендзе, зацвітае апоўначы на свята і якую адпраўляюцца шукаць. Вакол купальскага кастра вадзілі гульнёвыя карагоды, спявалі песні.  Ля вогнішча ўсе частаваліся абрадавай стравай, моладзь пераскоквала цераз агонь – ён лічыўся ачышчальным ад злых духаў.

**7 ліпеня.** Іван Купала (Іван Купальны, Іван, Пятроўскі Іван, Іван Летні, Іван Вялікі, Іван Посны, Іван Злосны, Іван Ведзьмін, Ян). Працяг купальскага свята. «Учора была Купала, а сёння Іван…», – спяваецца ў народнай песні. «На Пятроўскага Івана павінны быць гуркі ў мужыка, не толькі ў пана», – распавядае даўняя прыкмета. Другі дзень больш адпавядае царкоўным звычаям, бо адзначаецца нараджэнне Іаана Хрысціцеля.

**12 ліпеня.** Пятро (Пятроў дзень). Старадаўняе земляробчае свята, якое завяршае Купалле. Селянін заўважаў: «Святы Пятро – у жыце ядро», «Пятрок у касу звоніць».

Лічылася, што пасля Пятра лета ідзе на спад. «Прыйшоў Пятрок – апаў лісток», «Пётр і Павел на гадзіну дзень убавіў, Ілля-прарок два ўвалок».

**14 ліпеня.** Кузьма і Дзям`ян. Свята кавалёў

**21 ліпеня.** Градавы дзень. Засцерагаў ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы.

# Народныя традыцыі



Сучасная беларуская назва восьмага года месяца **жнівень**, таксама як і старабеларускія серпень, зарев, адлюстроўвае прыродныя асаблівасці пары. Дарэчы, найменне серпень захавалася ў украінцаў, чэхаў (srpen), палякаў (sierpień), іншых народаў.

Рымляне называлі гэты мясяц sehstylis, што значыць шосты (год пачынаўся тады вясною). Пазней рымскі сенат перайменаваў яго ў гонар імператара Актавіяна Аўгуста. Секстыліс налічваў 29 дзён, а аўгустус стаў мець 31. Заканадаўчы орган, аднолькава паважаючы Юліяна Цэзара і Актавіяна Аўгуста, зрабіў і аднолькава доўгімі месяцы, якія стаяць побач у годзе. Класічная назва месяца захавалася ў многіх заходнееўрапейскіх мовах, у тым ліку і ў рускай.

Жнівень дае знаць, што заканчваецца лета і набліжаецца восень. Ночы становяцца халаднейшымі, даўжэйшымі і цямнейшымі. Раніцай з’яўляюцца туманы. Працягласць светлавога дня змяншаецца ў параўнанні, напрыклад, з ліпенем прыблізна на 50 хвілін.

Яшчэ ў пачатку месяца заканчваецца ўборка азімых, затым убіраюцца пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, проса, лён-даўгунец, скараспелая бульба, іншая гародніна і садавіна. Людзі карыстаюцца і багатымі дарамі лесу. Таксама вядзецца сяўба азімых, касавіца атавы.



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**ліпень-жнівень 2023**

## НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Сучасная беларуская назва **восьмага месяца года жнівень**, таксама як і старабеларуская серпень, адлюстроўвае прыродныя асаблівасці пары.

**1 жніўня**. Серафім, Раман, Сцяпан, Міліца. А таксама Макрына, імя якой выклікае асацыяцыі з макрэчай: «Калі ў дзень Макрыны дождж, то восень будзе мокрая, а калі суха, то восень сухая».

**2 жніўня**. Прарок Ілля. Грымоты з маланкамі на Ілдю тлумачылі тым, што гэта сам прарок у вогненнай калясніцы раз’язджае па небе. А каб не ўзнік пажар ад навальніцы, стараліся не працаваць. Калі ж выпадала сонечнае надвор’е, баяліся гневу Іллі, які можа пакараць грэшную зямлю і людзей засухай. Нормай лічылася, што прарок Ілля прынясе дождж.

**4 жніўня**. Марыя Магдаліна, Фока, Карніл. Дажджы, непагадзь ад папярэдніх «мокрых» дзён Макрыны і Іллі не спыняліся: «Магдалена — вады па калена».

**6 жніўня**. Барыс і Глеб, Палікарп. Наступныя пасля Іллі прысвяткі былі цалкам падпарадкаваны жніву: «Барыс і Глеб — паспеў хлеб».

**9 жніўня**. Угоднік Панцеляймон лічыцца лекарам, асабліва ад хвароб галавы. Дзень адзначае таксама Мікалая, Анфісу, Клімента, Германа, Навума, Саву.

**12 жніўня**. Сіла, Андронік, Іван, Герман, Лука, Алімп, Максім, Валянцін, Апалон. Калі паспявалі закончыць жніво, гаварылі, што карысна пачаць сяўбу новага хлеба: «Хто на Сілу жыта пасее — у таго на хлеб надзея».

**14 жніўня.** Макавей (Макава, Макаўе, Першы Спас, Спас Мядовік, Медзяны Спас). Свята маку і мёду. Асвячалі ваду, зёлкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам і морквая. Прыказкі сцвярджаюць: “Першы Спас – провады лета”, “Ад Першага Спаса халодныя росы”.

**15 жніўня**. Прачыстая (Першая Прачыстая, Першы святок, Зельная). Існуе шмат прыказак і прыкмет на гэты дзень: “Прыйшла Прачыста – стала поле чыста”, “Зельная Божая Маці ўсяго можа нам даці”, “Да святка араць – лішнюю капу нажаць”, “Прачыстая прынясе хлеба чыстага”, “Першы Святок і першы світок”. Свенцяць зёлкі, кветкі, садавіну, збожжа, што лічацца гаючымі і аберагаючымі.

**19 жніўня**. Другі Спас, Яблычны Спас. Свята садавіны, якую асвячаюць, пасля чаго дазвалялася есці яблыкі, бо яны лічыліся грэшнымі пладамі. Згодна Біблії, змей-спакушальнік праз яблык зрабіў грэшнай Еву. Таму першыя плады неабходна было асвяціць у дзень Пераўтварэння Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста.

**22 жніўня**. Апостал Мацей, Антон, Юльян, Маркіян, Іван, Якуб, Аляксей, Дзмітры, Фоцій, Пятро, Лявонцій, Марыя. Большая частка работ у полі, як правіла, да гэтага тэрміну была выканана. Падступалася восеньская прахалода: «Пасля Мацея мужык на полі не пацея».

**28 жніўня**. Прачыстая (Успенне, Багародзіца, Першая Прачыстая, Вялікая Прачыстая, Гаспажа, Зялёная, Зельная). Прачыстая была сапраўдным святам ураджаю, яна падводзіла вынік працы селяніна: «Свята Прачыста — поле ўрачыста».

**29 жніўня**. Трэці Спас (Хлебны Спас, Арэхавы Спас). Шмат дзе спраўлялі дажынкі – свята канца жніва. Канец жніва і змена надвор’я адлюстраваны ў прыказках: “Трэці Спас хлеба прыпас”, “Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе”.

**31 жніўня**. Арабінавыя дзень і ноч. Пара, калі бывае “сухая” навальніца або буран цэлую ноч (дзень).

# Юбілейныя даты



## 25 жніўня 70 год з дня нараджэння Уладзіміра Арлова



**Арлоў Уладзімір Аляксеевіч** (нар. 25.08.1953, Полацк, Віцебская вобл.). Пісьменнік. Сябра Саюз пісьменнікаў з 1986 г. Адзін з заснавальнікаў Беларускага ПЭН-цэнтра.

Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1975). У 1975—1976 гг. выкладаў гісторыю ў школе ў Наваполацку. У 1976—1986 гг. працаваў у рэдакцыі гарадской наваполацкай газеты “Хімік” — карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара. У1988—1997 гг. — рэдактарам выдавецтва “Мастацкая літаратура”. Сябра СП СССР з 1986 г. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1990), срэбным медалём *“Zasłużony Kulturze Gloria Artis”* (Польшча, 2015), медалём 100 гадоў БНР (2018).

У друку выступае з 1976 г. Першыя творы змясціў у самвыдатаўскіх альманахах “Блакітны ліхтар” і “Мілавіца”. Аўтар кніг “Добры дзень, мая Шыпшына” (Мінск, 1986), “Дзень, калі ўпала страла” (Мінск, 1988), “Асветніца з роду Ўсяслава” (Мінск, 1989), “Пока не погасла свеча”(Москва, 1990), “Там, за дзвярыма” (Мінск, 1991), “Рандэву на манеўрах” (Мінск, 1992), “Еўфрасіння Полацкая. Евфросиния Полоцкая” (Мінск, 1992), “Прысуд выканаў невядомы. Ігнат Грынявіцкі” (Мінск, 1992), “«Совершенно секретно», альбо Адзін у трох іпастасях” (Мінск, 1992), “Міласць князя Гераніма” (Мінск, 1992), “Мой радавод да пятага калена” (Мінск, 1993), “Пяць мужчын у леснічоўцы” (Мінск, 1994), “Таямніцы полацкай гісторыі” (Мінск, 1994, 2000, 2002, 2008; па-руску: 1995, 2012), “Фаўна сноў” (Мінск, 1995), “Адкуль наш род” (Мінск, 1996; Вільня, 2000, 2003), “Рэквіем для бензапілы” (Мінск, 1998, па-польску: Białystok, 2000, па-украінску: Киів, 2005), “Божая кароўка зь Пятай авэню” (Мінск, 1998), “Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны. Гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай. Животворный символ Отчизны. История креста святой Евфросинии Полоцкой” (Мінск, 1998), “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі. 862—1918. Падзеі. Даты. Ілюстрацыі” (у суаўтарстве з Г. Сагановічам; Вільня, 1999, 2000, 2002; па-руску, Вільня, 2001), “Еўфрасіння Полацкая. Жыццяпіс і даследаванне спадчыны асветніцы” (Мінск, 2000), “Сны імператара” (Мінск, 2001), “Краіна Беларусь.

## 25 жніўня 70 год з дня нараджэння Уладзіміра Арлова



Ілюстраваная гісторыя (Мастак Зміцер Герасімовіч, Марцін (Славакія), 2003, Браціслава, 2012, 2013, па-руску: Братислава, 2013, па-англійску: Bratislava, 2013), “Ордэн Белай Мышы” (Мінск, 2003, 2013, Беласток, 2022), “Адкусі галаву вароне” (Мінск, 2003), “Каханак яе вялікасці” (Мінск, 2004, Беласток, 2022, па-польску: Wrocław, 2006), “Час чумы” (Мінск, 2005), “Сланы Ганібала” (Мінск, 2005), “Ад Полацка пачаўся свет” (Мінск, 2005, 2014), “Паром праз Ля-Манш” (Мінск, 2006, Беласток, 2022, па-польску: Gdańsk, 2009), “Імёны Свабоды” (Радыё Свабода, 2007, 2009, 2015, 2020, Беласток, 2023), “Усё па-ранейшаму толькі імёны зьмяніліся” (Мінск, 2009, па-украінску: Київ, 2021), “Ля Дзікага Поля” (Мінск, 2010), “Пакуль ляціць страла. 100 пытаньняў пісьменьніку” (Радыё Свабода, 2012), “Сьвецяцца вокны ды нікога за імі” (Мінск, 2012), “Patria aeterna” (Miensk, 2015), “Айчына: маляўнічая гісторыя. Ад Рагнеды да Касцюшкі (Мастак Павел Татарнікаў, Мінск, 2016, 2017, 2019), “Танцы над горадам” (Мінск, 2017, 2018, Беласток, 2022), “Краіна Ур” (Мінск, 2018), “Я марыў стаць шпіёнам” (Мінск, 2018), “Вустрыцы а пятай раніцы” (Мінск, 2018), “Архіварыус Война” (Мінск, 2018), “Belarus. The epoch of the Grand Duchy of Lithuania. An illustrated history” (Vilnius, 2018), “Faszination Belarus. Illustrierte Geschichte. Eines unbekannten landes” (Vilnius, 2018), “Паручнік Пятровіч і прапаршчык Здань” (Мінск, 2018, па-польску: Lublin, 2021), “Краєвид з ментоловим ароматом” (Львів, 2021), “Апоўначы ў Лонданскім доме” (Беласток, 2022), “Незалежнасць гэта…” (Беласток, 2022), “Айчына. Ад Агінскага да Багушэвіча” (Беласток, 2023).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1986), выдавецкай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча (1993), літаратурнай прэміі імя Францішка Багушэвіча (1996), прэміі Таварыства вольных літаратараў “Гліняны Вялес” (1998), прэміі імя Барыса Кіта (Германія, 2004), прэміі “Залатая літара” (2006), міжнароднай прэміі “Еўрапейскі паэт свабоды” (Польшча, 2010), прэміі часопіса “Дзеяслоў” “Залаты апостраф” (2015), міжнароднай літаратурай прэміі “Алеко” (Балгарыя, 2016), літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча (2016), прэміі Цёткі (2017), Літаратурнай прэміі імя Ежы Гедройца (2018).

## Жывая граматыка

Той, хто быць пісьменным хоча,
ведаць мусіць з першых год
род мужчынскі, род жаночы
і яшчэ — ніякі род.
Гусь уранні выйшла з хаты,
важна тупае лужком.
А за ёю — гусяняты,
дзе падскокам, дзе трушком.
Тут яна як с-с-сыкане
ды ў атаку — на мяне:
— Га-га-га!
Ды го-го-го!
Да-га-га-ганю яго!..
Ледзь схаваўся я за плот...
Гусь — яна?
Жаночы род!
Ах я, бедны, небарака.
Ззаду гусь, а тут — сабака.
І гырчыць, і шчэрыць зубы.
Дзе схавацца мне ад згубы?
Што рабіць? І, нібы кот,
я ўскараскаўся на плот.
А сабака аж якоча —
учапіцца ў лытку хоча.
Ён пільнуе агарод...
Ён? Ага, — мужчынскі род!
Колькі гэтак — вось няўдача! —
Пратырчу на плоце я?
Азірнуўся, ажно бачу:
тут яшчэ і кацяня!
— Мяў, — гаворыць мне яно, —
я даўно сяджу, даўно.
Аднаму так страшна — вох!
Ваяваць смялей удвох...
І адразу — хвост трубой.
І гатовае у бой...
Кацяня — яшчэ не кошка.
Кацяня — яшчэ не кот.
Ну, а род? Падумай трошкі.
Раз яно — ніякі род!
Я запомню назаўсёды
пасля гэткае прыгоды:
род мужчынскі,
род жаночы,
род ніякі — ўсе тры роды.

А.Вольскі

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**ліпень-жнівень 2023**



Уладзімір МАЦВЕЕНКА

## Загадка-лагагрыф

Вася Вясёлкін з Васілінкай
і сябрамі задумалі паехаць
на экскурсію. Паўстала пытанне:
у які дзень? Нехта сказаў:
– Давайце паедзем у ...

1.
Калі да пэўнай літары
Дапісаць яшчэ літару, –
Атрымаецца канчатак
Многіх слоў. (Аў)

Калі да дзвюх літар
Дапісаць трэцюю,–
Атрымаецца тэрмін
Гульні ў футбол. (Аўт)

Калі да трох літар
Дапісаць чацвёртую, –
Атрымаецца скарочаная
Назва аўтамабіля. (Аўто)

Калі да чатырох літар
Дапісаць яшчэ тры,
Якія з'яўляюцца
Назвай жывёліны,
Што жыве ў вадаёмах
З чыстай вадой, –
Атрымаецца дзень тыдня. (Аўторак)
Васілінка прапанавала прыйсці ў ...

2.
Калі да пэўнай літары
Дапісаць яшчэ адну літару, –
Атрымаецца назва
Меры зямлі. (Га)

Калі да дзвюх літар
Дапісаць трэцюю, –
Атрымаецца едкі пах
Ад згарання чаго-небудзь. (Гар)

Калі да трох літар
Дапісаць чацвёртую, –
Атрымаецца
Высокае ўзвышша. (Гара)

Калі да чатырох літар
Дапісаць пятую, –
Атрымаецца схова,
Дзе стаяць аўтамашыны.
Там іх будзе чакаць ... (Гараж)

3.
Калі да пэўнай літары
Дапісаць яшчэ літару, –
Атрымаецца назва
Грэчаскай літары. (Пі)

Калі да дзвюх літар
Дапісаць трэцюю, –
Атрымаецца назва
Самага верха гары. (Пік)

Калі да трох літар
Дапісаць чацвёртую, –
Атрымаецца назва
Дзіды па-руску. (Піка)

20



**Рэдактар Юрчанка С.А.**